Прэцэдэнтныя лексемы служаць аб'ектыўным крытэрыем і эфектыўным інструментам семантычнага аналізу тэкстаў і адначасова даюць магчымасць назапашваць адзінкі для слоўніка мовы беларускай духоўнай культуры.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Апресян, Ю. Д. Дейксис в лексике и грамматике и наивная картина мира / Ю. Д. Апресян // Избранные труды: в 2 т. / Ю. Д. Апресян. – М.: Яз. рус. культуры, 1995. – Т. 2: Интегральное описание языка и системная лексикография. – С. 629–650.
2. Сычова, Е. К. Функционально-семантическая структура басенного афоризма: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.19 / Е. К. Сычова. – Минск, 1996. – 19 с.
3. Колас, Я. Збор твораў: у 12 т. / Я. Колас. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1961–1964. – 12 т. (Тут і далей цытаты з мастацкіх твораў падаюцца паводле гэтага выдання з пазначэннем у круглых дужках адпаведнага тома і старонкі.)
4. Реймерс, Н. Ф. Словарь терминов и понятий, связанных с охраной живой природы / Н. Ф. Реймерс, А. В. Яблоков. – М.: Наука, 1982. – 145 с.
5. Abramowich, M. Francuski *peuple* i polski *lud*. Dwa pojęcia – dwa paradygmaty językowo-kulturalne / M. Abramowich M., J. Bartmiński // Etnolingwistyka: problemy języka i kultury. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 1996. – T. 8. – S. 41–56.
6. Słownik stereotypów i symboli ludowych / koncepcja całości i redakcja J. Bartmiński, z-ca redaktora S. Niebrzegowska-Bartmińska. – Lublin: Wydawnictwo UMCS, 2012. – T. 1: Kosmos. – 439 s.

*УДК 811.161.3'373*

# СЕМАНТЫКА-НАМІНАЦЫЙНАЯ МІКРАСІСТЭМА КОЛЕРААБАЗНАЧЭННЯ Ў ВЕРШАХ ЯНКІ КУПАЛЫ

**М. У. Разладава**

*Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*ipd401@mail.ru*

У артыкуле даецца характарыстыка семантыка-намінацыйнай мікрасістэмы колераабазначэння ў вершах Янкі Купалы ў семасіялагічным, дэрываталагічным і граматычным аспектах. Робіцца вывад пра align="center"рознаўзроўневы характар моўных адзінак названай сістэмы ва ўсіх разгледжаных аспектах і ў розныя перыяды творчасці паэта.

*Ключавыя словы:* колер; колеранамінацыя; колераабазначэнне; семантыка-намінацыйная мікрасістэма; лексічная спалучальнасць.

# SEMANTIC-NOMINATIVE MICROSYSTEM OF COLOUR VISION IN YANKA KUPALA'S POEMS

**M. U. Razladava**

*Institute of Entrepreneurial Activity*
*Minsk, Republic of Belarus*
*ipd401@mail.ru*

The article describes the semantics of the nominative microsystem of colour vision in Yanka Kupala's poems in semiological, derivational and grammatical aspects. It is concluded that multilevel nature of the language units of is considered in all the aspects of the named system and in different periods of the poet's work.

*Key words:* colour; colour nomination; colour vision; semantics-nominative microsystem; lexical compatibility.

Колеранамінацыі – моўныя адзінкі, аб’яднаныя агульнай семай ‘якога-небудзь колеру’, ‘які мае (можа мець) які-небудзь колер або прадмет гэтага колеру ў якасці сімвала’, ‘які можа асацыявацца з якім-небудзь колерам’. Гэты даклад – спроба шматаспектнага аналізу колеранамінацый (КН) у лірыцы Янкі Купалы. Усяго ў вершах паэта зафіксавана каля 200 КН, ужыты яны больш чым 800 разоў.

Паводле семантычных і граматычных характарыстык самую шматлікую групу КН складаюць колераад’ектывы – КН, семантычна і граматычна суадносныя з прыметнікамі. Колераад’ектываў у купалаўскай лірыцы ўжыта 82, у тым ліку 40 простых, 21 – складаных (кампазітаў), 21 – састаўных (комплексных). Сярод простых, як паказвае фактычны матэрыял, найбольш частотнымі з’яўляюцца *чорны, белы, чырвоны, зялёны.* Першы з іх абазначае колер, што звычайна выклікае адмоўныя асацыяцыі; колераад’ектыву *чорны* супрацьпастаўляюцца *белы, чырвоны, зялёны,* што называюць традыцыйныя беларускія нацыянальныя колеры.

КН *чорны* ўжываецца ў лірыцы Янкі Купалы 120 разоў. Варта звярнуць увагу, што 49 разоў гэта КН спалучана з назоўнікамі – назвамі паняццяў, звязаных з філасофскай і псіхалагічнай навукай: *беспрасвецце, Бог, бяда, вызыск, гора, горасць, доля* (а таксама форма множнага ліку *долі), келіх жыцця, нядоля, лёс, пагібельнасць, патрэба, сумленне, ява;* грамадска-палітычнай і ваеннай сферай: *гульня, змей, зграя, напасць, пажарышча, сіла* (метафарычна – у дачыненні да царызму, фашызму, а таксама асоб, што з’яўляюцца іх ідэйнымі прыхільнікамі)*, саюз, сотні, уладанне;* катэгорыямі прасторы і часу: *дзень, ноч, усход.* Найбольшай частотнасцю сярод іх вылучаецца назоўнік *доля* (ужыты 8 разоў): «Ад зары да зары па радзімай зямлі // Зацяганыя людзі снуюцца, // І гаруюць яны, рэдка шчасны калі, // З **чорнай доляй** змагаюцца, б’юцца» [2, с. 154]; «Дажывае стара маці // Сіраціною у хаце, // Ў соннай волі, ў **чорнай долі,** // Як та груша сярод поля…» [3, с. 198]. Адметнасцю купалаўскага словаўжывання, якая мае сваім вытокам традыцыйную міфалогію і народную паэзію, можна назваць ужыванне эпітэта-КН для апісання знешнасці жывых істот, абазначаных назоўнікамі *гадзіны* (ужыта 1 раз)*, груган* (5 разоў)*, крукі, начніцы, п’яўка* (па 1 разе), а таксама *вопратка (гругана)* (1 раз): «Кожнай вясны, як выходжу // Свой засяваці загон, // **Чорны груган** вылятае // Знекуль – з няшчасных старон» [4, с. 60]; «А ляцець было нялёгка,– // **Груган чорны** пасвіў. // Шлях нязведаны шырока // Небяспекай слаўся» [5, с. 138]; «Чаго **чорныя** // **Крукі** грагаюць?» [2, с. 7].

КН *белы* (разам з кароткай формай *бел* і яе ўсечанай формай-амонімам) ужываецца ў купалаўскіх вершах 73 разы, *чырвоны* (і кароткая форма *чырван*) – 74 разы. Адметнасцю КН *чырвоны* можна назваць ужыванне яе пераважна з назвамі рэалій, звязаных з камуністычным ладам, з савецкай уладай, – 56 разоў, у тым ліку 3 разы – у назвах калгасаў, 21 раз лексема *чырвоны* зафіксавана ў назве *Чырвоная Армія,* 12 разоў – у спалучэнні *чырвоны сцяг* (у тым ліку 6 разоў абодва кампаненты названага спалучэння падаюцца з вялікай літары), якое называе адзін з сімвалаў савецкай дзяржавы: «Твой вітае сцяг поўнач і поўдзень, // **Сцяг чырвоны,** дзе толькі ён дойдзе» [5, с. 170]; «Ідуць мільёны. // Шлях не скрывіць // Ні ўсходні вецер, ні заходні. // Усходы буйныя на ніве // Азнакай на шляху шчаслівай, // **Чырвоны** ў сонцы **сцяг** паходняй» [5, с. 144].

Аналіз назоўнікаў розных тэматычных груп, спалучаных з КН *белы,* не паказвае абсалютнай колькаснай перавагі спалучэнняў з назоўнікамі якой-небудзь групы: 17 разоў КН *белы* разам з формай *бел* ужыты з назвамі рэалій нежывой прыроды, 10 – з назвамі жывой прыроды, 8 – з назвамі асоб і частак цела чалавека для характарыстыкі знешнасці чалавека, 15 – з назвамі рэалій рэчаіснасці, створаных чалавекам; асобна варта вылучыць спалучэнне *белы свет* і цэльнааформленае найменне *бел-свет* (адпаведна 11 і 5 ужыванняў), а таксама спалучэнне *белы арол,* якое служыць для апісання герба Польшчы і актуалізуецца ў вершах на тэму польскай акупацыі Беларусі (4 ужыванні); акрамя таго, прыметнік *белы* зафіксаваны ў складзе 37 уласных назваў (усяго 4 ужыванні) *Белае мора, Белая Русь, Белы Бог*: «Пясняр жа зрэнкаю саколяй // Ўвесь аблятае **белы свет** [1, с. 121]; «Трох сыноў чараўнік на **свет белы** выводзіў, // Трох сыноў, што хаваў уза-перці…» [3, с. 56]; «Ляжыць, уецца ў **бел-свет,** як вужака, // Стары, утоптаны вякамі шлях…» [3, с. 194]; «І нясуцца хай гэтыя шумы, // Па **бел-свету** ляцяць, хай ляцяць» [2, с. 105]; «**Арол белы** над Мінскам, // А з ім польскія дары: // Катаванні, пагромы, // Шыбяніцы, пажары» [4, с. 171]; «Беларускі расол **белы** хлебча **арол,** // Да то ўправа, то ўлева хвост верце» [4, с. 80].

КН *зялёны* ўжыта ў вершах Янкі Купалы 68 разоў у спалучэнні з назвамі раслін, іх частак, аднак перавагу паэт аддае ўжыванню названай КН у спалучэнні з сукупнасцямі раслін: лексема

*бор* ужыта 11 разоў (1 раз – форма множнага ліку *бары*), *лес* – 10 разоў (3 разы – форма множнага ліку *лясы*), *луг* – 5 разоў, прычым 2 разы – у форме *на лугу* і 1 раз – *у лузе* (2 разы ўжыта форма множнага ліку лугі); *гай* – 3 разы: «Ой, **у лузе у зялёным,** // Каля быстрай рэчкі, // Маладзенькая дзяўчына // Пасціла авечкі» [3, с. 156]; «А як слала я лянок // На **зялёным** на **лугу,** // Дзе папаўся Міхасёк, // Цалавала на бягу» [5, с. 70].

Сярод складаных колераад'ектываў варта адзначыць тыя, што матываваны словазлучэннямі з падпарадкавальнай сувяззю і ўтвораны складаннем з суфіксам або без яго. Яны спалучаюцца з назвамі асоб, рэалій жывой прыроды (для метафарычнай характарыстыкі асоб): *белаліца* (дзяўчыначка), *сізакрылы* (арол), *чарнаброва* (татарка), *чарнасоцкі* (Дубровін): «Джамбул, **сізакрылы** сталетні **арол,** // Бурліцца крынічна жыццё навакол» [5, с. 126].

Радзей сустракаюцца КН, матываваныя спалучэннямі са злучальнай сувяззю для характарыстыкі рэалій, створаных чалавекам: *бела-чырвоны* (сцяг), *бледна-замглёны* (саван). Цікавасць уяўляе КН *бурштын-сам* (зярно), якая не мае прыметнікавых кампанентаў (матывавальнымі з'яўляюцца назоўнік *бурштын* і займеннік *сам*), аднак служыць для якаснай характарыстыкі рэаліі, абазначанай назоўнікам *зярно,* з'яўляецца семантычна тоеснай параўнальнаму звароту *зярно, як бурштын* і таму можа быць аднесена да колераад'ектыўных намінацый: «Лубянку-сявалку // Дзед сплёў мне даўно, // Ў сявалцы без малку // **Бурштын-сам зярно**» [4, с. 44].

Абсалютную большасць сярод састаўных колераад'ектываў складаюць параўнальныя звароты са злучнікам *як,* што ўключае назоўнік або назоўнік з прыметнікам, а таксама спалучэнні прыметнік + параўнальны зварот са злучнікам *як: як бурштын* (зерне); *як зялёны дыван* (ніва)*; чырвоны, як маліна* (твар)*; як маліна* (твар). *Сярод* састаўных колераад'ектываў вылучаюцца тыя, што называюць колеравую прымету прадмета і маюць у сваёй структуры назоўнік меснага або (радзей) вінавальнага склону з прыназоўнікам *у*: *у белі* (цень), *у колер* (вокладка), *у сонцы* (зброя); спалучэнні слоў з апорным кампанентам – назоўнікам, якія служаць для якаснай характарыстыкі рэаліі (звычайна ў купалаўскай паэзіі – для характарыстыкі знешняга выгляду асобы, пераважна дзяўчыны): *каласісты вянок жыта* (коска)*, не калінкі – проста спелыя малінкі* (губкі), *дзве пралескі ці два ў збожжы васілёчкі* (вочкі). КН *чырвонасці дзіўнай* – словазлучэнне з апорным назоўнікавым кампанентам *чырвонасць,* матываваным колераад'ектывам *чырвоны,* якое ў кантэксце замяніла гэты колераад'ектыў, стаўшы яго семантыка-стылістычным сінонімам: «Аздобяцца [гарады] ў сцягі **чырвонасці дзіўнай,** // Што ў нас зіхацяцца – у сцягі такія» [5, с. 18].

Колеравербатываў у купалаўскай лірыцы ўжыта 70, у тым ліку 22 простых, 48 – састаўных. Усе колеравербатывы, у тым ліку простыя, адрозніваюцца тым, што выпадкі ўжывання кожнага з іх нешматлікія, большасці – адзінкавыя. Колеравербатывы адрозніваюцца семантычнай разнастайнасцю, служаць не толькі для называння колеравай прыметы, але і для актуалізацыі семантыкі, звязанай са станам прыроды, фізічным і псіхалагічным станам чалавека: «Пасяродку аўса галавісты **лянок // Зелянее,** інакш адбівае сабой…» [1, с. 195]; «Ой, жывецца на свеце, жывецца // Чалавеку так слаўна, так лоўка, // Аж і спіна штосьць гнецца, здаецца. // Затраслася, **ссівела галоўка**» [2, с. 158]; «Ці вас выкапалі людзі, // Як праўду хавалі?.. // **Ачарнілі фальшам** грудзі // І помстай шакаляй» [1, с. 176].

Значная колькасць састаўных колеравербатываў (у 2 разы большая, чым простых) – пацвярджэнне дыялектычнага адзінства традыцый і наватарства ў моўна-выяўленчай сістэме купалаўскай паэзіі: блізкасць да народна-песеннай паэзіі, разгалінаванасць семантыкі традыцыйных (сталых) колеравых эпітэтаў не перашкаджала паэту ствараць новыя моўныя адзінкі, у тым ліку аналітычныя – сінонімы гэтых традыцыйных КН. Варта адзначыць, што кампанентамі структуры састаўных колеравербатываў бываюць КН розных часцін мовы: колеранамінатывы: *пабелай залёг* (снег)*; услаць чарнатой* (неба)*; у зелень спавіваць* (ніву)*;* колераад'ектывы: *зрос зялёны* (мох); *лунае крывавае* (сонца*), як мак, калышуцца, чырвоны* (сцягі); колераадвербатывы: *рунець зелена* (загон); *срыбна зацвісці* (расіца). Аналіз фактычнага матэрыялу паказвае, што Янка Купала выкарыстоўваў самыя разнастайныя прыёмы для сувязі мікрасістэмы колераабазначэння з іншымі мікрасістэмамі назваў якасных характарыстык рэалій рэчаіснасці. Так, ужыванне састаўнога колеравербатыва ў тэксце «Сонейкам цёпленькім, **зеленню вабнаю // Абдаравала зямельку вясна**» [1, с. 102] абумоўлена неабходнасцю актуалізаваць не толькі сему 'зрабіць зялёным', звязаную з колераабазначэннем, але адначасова і сему 'зрабіць цёплым', для чаго паэт ужыў рад аднародных членаў з эпітэтамі *сонейкам цёпленькім і зеленню вабнаю.*

Колеранамінатываў – КН, семантычна і граматычна суадносных з назоўнікамі, у лірыцы Янкі Купалы ўжыта 24, у тым ліку 19 простых, з іх 2 – субстантываваныя прыметнікі *чорнае, чырвонае*; 5 – складаных. Субстантываваныя назвы ўжыты ў вершах на грамадска-палітычную тэматыку: «Стаў даводзіць селяніну // **Нехта** нейкі ў **чорным:** // Як павінен быці ўслужным, // Згодлівым, пакорным. \\ Бо і пчолцы,– **кажа ў чорным,** – // Мёд гадуюць кветкі, // У згодзе з пчолкамі і трутні // П'юць той мёд, як дзеткі» [3, с. 182]; «Судзіце суды мураўёўскім законам // Над людам, загнаным у краты, // А выдасць прысуд свой **суддзя у чырвоным** // На вас на саміх, цараняты» [5, с. 25].

Найбольш ужывальны сярод колеранамінатываў – *бель* ўжываецца ў лірыцы Янкі Купалы 8 разоў пры апісанні рэалій прыроды: «Шастае лісце пахучай гарбаты, // Лісце і шоўкам **калышацца ў белі**» [5, с. 117]; «Залягла, як пасцель, // **Лебядзіная бель** // На загон, на курган» [2, с. 94].

Складаныя колеранамінатывы матываваны словазлучэннямі з падпарадкавальнай сувяззю і ўтвораны суфіксальна-складаным спосабам. Яны служаць для наймення асоб паводле знешняга выгляду, прыналежнасці да пэўнай палітычнай групы: *белапалякі, чарнасотнікі;* для характарыстыкі рэалій жывой прыроды: *белалічка* (панна); *златапёрка* (курка): «Як не выйдуць **чарнасотнікі,** // На благое ўсё ахвотнікі, // Дый на ўсю моц закрычаць: «Думу трэба разагнаць!» [2, с. 20]; «Мая **курка-златапёрка** // Ад усходу да вячорка // Па дварэ ходзіць…» [4, с. 184].

Такім чынам, семантычна-намінацыйная сістэма колераабазначэння ў лірыцы Янкі Купалы вызначаецца шматлікасцю і рознаўзроўневасцю намінацый, якія яе складаюць, іх семантычнай і граматычнай разнастайнасцю, якія, аднак, не заўсёды ўзаемаабумоўлены (КН *зялёны* спецыялізуецца выключна на характарыстыцы назваў раслін, іх сукупнасцей; спецыялізацыя КН *чорны* і *чырвоны* менш выразная – адпаведна на характарыстыцы рэалій філасофскай і грамадска-палітычнай сфер, з'яўляючыся іх сімваламі; састаўныя колеранамінатывы і колеравербатывы колькасна пераважаюць над простымі, простыя колераад'ектывы – над састаўнымі).

**Бібліяграфічны спіс**

1. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады 1904–1907. – 462 с.
2. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – Т. 2: Вершы, пераклады 1908–1910. – 342 с.
3. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 3: Вершы, пераклады 1911–1914. – 342 с.
4. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 4: Вершы, пераклады 1915–1929. – 446 с.
5. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1998. – Т. 5: Вершы, пераклады 1930–1942. – 278 с.

*УДК 811.161.3'373*

# КАНЦЭПТ *ВЯЛІКІ* Ў МОВЕ ЯНКІ КУПАЛЫ

**В. А. Скачкова**

*Гомельскі філіял установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*
*skachkovatina@yandex.by*

Мэтай даследавання з'яўляюцца моўныя сродкі семантыка-структурнай і фармальнай вербалізацыі канцэпту *вялікі* ў моватворчай дзейнасці класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. У артыкуле выяўлены цэнтр і перыферыя, устаноўлены кагнітыўныя прыкметы, прадстаўленыя ў сістэмным змесце складовых канцэпту.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; канцэпт; метафара; словаўтварэнне; формаўтварэнне.